# II. ХАРАКТЕР ЦЕННОСТНЫХ ОРИЕНТАЦИЙ В ЛИТЕРАТУРЕ

**Т.Р. Багарадава**
Установа адукацыі "Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт"
e-mail: t.baharadava@psu.by

УДК 82.09

## СРОДКІ ВЫРАЖЭННЯ АКСІЯЛАГІЧНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ У "ВАЕННАЙ" АПОВЕСЦІ І. ШАМЯКІНА "АГОНЬ І СНЕГ"

*Ключавыя словы: аксіялогія, каштоўнасці, агульначалавечыя каштоўнасці, каштоўнасныя арыентацыі, сістэма каштоўнасцей.*

*У артыкуле разглядаюцца асноўныя сродкі паказу каштоўнасных арыентацый асобы з праекцыяй на мастацкую літаратуру. Прадметам даследавання з'яўляецца аповесць "Агонь і снег" – трэцяя ў пенталогіі І.Шамякіна "Трывожнае шчасце". Паказваецца іерархія аксіялагічных арыентацый герояў аповесці, актуалізацыя каштоўнасцей у выніку змены знешніх і ўнутраных фактараў.*

Патрэба ў вызначэнні каштоўнасных арыентацый, прыярытэтаў і сэнсу жыцця ўзнікае ў кожнага чалавека, што з'яўляецца неад'емнай часткай фармавання асобы. Адметнасці станаўлення асобы залежаць ад многіх фактараў: дамінуючага гістарычнага этапу; эканамічнага і культурнага ўзроўню развіцця грамадства; каштоўнасных прыярытэтаў, якія прапаноўваюцца акаляючым асяроддзем і сям'ёй; задачамі, што патрэбна вырашыць у розныя ўзроставыя перыяды.

За працяглы час існавання грамадства выпрацаваныя агульначалавечыя каштоўнасці і нормы маральных паводзін. "У грамадстве заўсёды з'яўляюцца каштоўнымі дабрыня, пастаянства, шчырасць, узаемадапамога і абвяргаюцца цынізм, падман, сквапнасць, ганарыстасць, злачынствы" [3].

У сучасным грамадстве асноўнымі агульначалавечымі каштоўнасцямі з'яўляюцца сям'я, здароўе, адукацыя, праца. Агульначалавечыя каштоўнасці непасрэдна звязаны з агульнымі каштоўнасцямі чалавека. Іх умоўна можна падзяліць на матэрыяльныя і духоўныя (маральныя). Кожны чалавек аддае перавагу тым ці іншым каштоўнасцям, рэалізацыя якіх неабходная для самасцвярджэння асобы. Выбар залежыць ад чалавечай індывідуальнасці, напоўненасці ўнутранага свету асобы, разнастайнасці інтарэсаў. Светаўспрыманне чалавека і яго лад жыцця фармуюцца на працягу існавання асобы. Вядучую ролю адыгрываюць традыцыі, што склаліся ў грамадстве: нацыянальныя, рэлігійныя і сацыяльныя. Значная роля адводзіцца акружэнню чалавека: сям'і і сябрам.

Даследчык В.Н.Куніцына адзначае, што адначасова ў свядомасці чалавека існуе не больш за дванаццаць каштоўнасцей, якімі ён можа кіравацца. Назіранні і сістэматычныя навуковыя даследаванні паказваюць, што за сваё жыццё чалавек, ставячы перад сабой шэраг аксіялагічных прыярытэтаў, у некаторай ступені рэалізуе толькі адзін-два. Яны становяцца фундаментальнымі матыватарамі дзейнасці.

Іерархія каштоўнасных арыентацый асобы з'яўляецца дастаткова ўстойлівай. Паводле вызначэння М.І.Бобнева і Е.Д.Дарафеева каштоўнасная свядомасць асобы аднатыпова праяўляецца ва ўсіх сферах жыцця і дзейнасці чалавека. М.А.Сомаў мяркуе, што каштоўнасныя арыентацыі змяняюцца вельмі павольна, бо адлюстроўваюць глыбінныя і менш зменныя пласты псіхікі чалавека. Даследчык Т.Шыбутані сцвярджае, што "свядома ці бессвядома людзі імкнуцца рэалізоўваць тыя магчымасці, якія адпавядаюць іх асноўным каштоўнасцям" [3]. Такім чынам, у жыццядзейнасці грамадства, сацыяльных груп і чалавека каштоўнасці выступаюць сацыяльным крытэрыем ацэнак ў выбары альтэрнатыў найбольш жаданага і даступнага.

І.В.Фядосава канстатуе: "Узмацненне дынамікі сацыяльных супрацьлегласцей абвастрае пытанні каштоўнасна-сэнсавага самавызначэння…грамадзян" [5]. Мастацкая літаратура з'яўляецца своеасаблівым фіксатарам культурна-гістарычных акалічнасцей і адлюстроўвае адпаведную спецыфіку формаў паводзін чалавека.

Беручы за аснову, у сувязі з абранай тэматыкай, разгляд аповесці І.Шамякіна "Агонь і снег", якая з'яўляецца трэцяй часткай пенталогіі "Трывожнае шчасце" і можа лічыцца адносна самастойным творам, мы мелі на мэце прасачыць функцыянаванне пералічаных вышэй акалічнасцей фармавання аксіялагічных прыярытэтаў у дачыненні менавіта да жанру "ваенная" аповесці.

Вайна выступае арэнай абвастрэння сацыяльных праблем чалавечага грамадства, квінтэсенцыяй супрацьлегласцей, у тым ліку і каштоўнасных. А.Г.Асмолаў называе ўражанні чалавека ў такой сітуацыі "шокам ад цяперашняга". У такім умовах чалавек імкнецца выпрацаваць у



Репозиторий ВГУ

сабе і прыняць такія каштоўнасці, якія дазволяць яму знайсці сваё месца ў розных сістэмах і самавызначыцца. Асабліва складана вызначыцца маладому пакаленню, маральныя крытэрыі паводзін якога не ўстаяліся, а сістэма каштоўнасцей – рухомая.

І.Шамякін у пенталогіі стварае вобразы маладых людзей, на долю якіх выпадаюць шматлікія выпрабаванні існуючай эпохі: сталіншчына, Вялікая Айчынная вайна, пасляваеннае аднаўленне грамадства. Аўтар паказвае абвастрэнне супрацьлегласцей паміж асобай, якая фармуецца, і новым грамадствам. Трэцяя аповесць пенталогіі "Агонь і снег" – найбольш паказальная ў сувязі з дадзенымі акалічнасцямі. Яна напісана ў форме дзённіка, што дае падставу казаць пра асаблівую праўдзівасць адлюстравання падзей і працяг традыцый беларускай "ваеннай" аповесці, пачынаючы з часоў М.Гарэцкага.

С.Л.Рубінштэйн мяркуе, што "тыя ці іншыя каштоўнасці актуалізуюцца ў выніку змен унутраных і знешніх умоў" [4]. Ваенныя дзеянні – асноўны каталізатар такіх змяненняў. Аповесць "Агонь і снег" пачынаецца наступнымі радкамі: "Вайна… Трэція суткі, як яна пачалася. Ударыла, як гром з яснага неба, аглушыла, і я ніяк не магу апомніцца…Гэты звон і гул у галаве з'явіўся адразу ж, як толькі я першым на батарэі пачуў аб вайне. І страх (мне сорамна прызнацца ў гэтым), страх таксама запаланіў душу з першых хвілін. Увесь час думаю пра смерць. Няўжо гэта канец? У дваццаць адзін год?" [7]. І. Шамякін як адметны псіхолаг ламае стэрэатыпы адлюстравання зрухаў свядомасці галоўнага героя – Пятра Шапятовіча – маладога чалавека, на долю якога выпала шмат маральных выпрабаванняў. Нагадаем, што доўгі час ў савецкай літаратуры пры адлюстраванні падзей вайны і яе ўспрымання савецкімі людзьмі існаваў кананічны паказ, які прадугледжваў геразацыю ўчынкаў персанажаў і дамінаванне патрыятычных памкненняў.

У айчыннай літаратуры ўзнаўляецца каштоўнасна-нарматыўная аснова беларускай культуры, якая абумоўлівае наяўнасць у літаратурных творах маральнага, эстэтычнага, агульначалавечага рэсурсу, які адлюстроўваецца ў аксіялагічных катэгорыях патрыятызму, сацыяльнай адказнасці, гуманізму, дабра і зла, сумлення. Л.Талстой казаў: "Вось дзе вучышся жыць. Бачыш розныя погляды на жыццё, на каханне, з якімі можна не пагадзіцца, але свой уласны становіцца разумнейшы і цверазейшы" [1, с.41-44]. І. Шамякін паказвае рэфлексію галоўнага героя – змену яго маральных каштоўнасцей, сталенне: "Дзіўная рэч! Ці даўно быў той час, калі я любіў чытаць пра вайну і, як, напэўна, многія мае равеснікі, употай марыў аб ваенным подзвігу?...Наіўны хлопчык! Ты можаш памерці, не зрабіўшы аніякага подзвігу, нават самага маленькага…Зусім інакшай паўстала ў маім уяўленні вайна – нічога прыгожага, адно жудаснае. Я думаю: якое гэта шчасце – мір, цішыня на зямлі!" [7].

У літаратурным творы існуюць розныя формы прысутнасці чалавека. Гэта апавядальнік, лірычны герой і персанаж, які раскрывае чалавека найбольш поўна. Паказальным з'яўляецца той факт, што ў аповесці Пятро Шапятовіч выступае ў траякай ролі, таму падзейная і маральная канва твора вельмі абвостраная. "Героі літаратуры розных краін і эпох бясконца разнастайныя. Разам з тым…заўважаецца паўтаральнасць, звязаная з жанравай прыналежнасцю твора і, што яшчэ значней, з каштоўнаснымі арыентацыямі дзейсных асоб" [2]. Побач са шматлікімі творамі замежных аўтараў пра першую і другую сусветную вайну, якія стварылі шырокі спектр літаратурных герояў, вобраз Пятра Шапятовіча ў айчыннай літаратуры супастаўляльны з вобразам Лявона Задумы з цыклу твораў М.Гарэцкага. У творы "На імперыялістычнай вайне", які варта па ўсіх канонах лічыць "ваеннай" аповесцю, таксама ў дзённікавай форме ад асобы галоўнага героя распавядаецца пра натуралізм ваеннай рэчаіснасці, паказваецца змена аксіялагічных арыентацый маладога чалавека, прапагандуюцца маральныя каштоўнасці.

Аповесць "Агонь і снег" раскрывае ў форме дыялогу паміж Пятром Шапятовічам і яго сябрам Сенем Пясоцкім сутнасную неабходнасць маральнага адлюстравання рэчаіснасці, яе праўдзівага апісання: "…Я не люблю дзённікаў. У іх хлусяць…Не, я напішу праўду. Напішу ўсё, што перажыў, перадумаў…Я пішу для Сашы, а ёй я ніколі не хлусіў…" [7].

Э.Фром пісаў: "Няма ніводнай культуры, якая магла б абыйсціся без сістэмы каштоўнасных арыентацый ці каардынат" [2]. Традыцыйнымі ў агульнапрынятым вызначэнні прадстаўленыя маральныя каштоўнасці герояў аповесці І.Шамякіна. Сям'я з'яўляецца прыярытэтным каштоўнасным арыенцірам для герояў аповесці. Для галоўнай гераіні Сашы Траянавай сям'я бачыцца ў хрысціянскім разуменні – раз і назаўсёды. Не зусім тыповай з'явай падаецца паказ здрады галоўнага героя сваёй каханай. Тым не менш, маральныя каштоўнасці дамінуюць: Пятро праходзіць доўгі шлях пакаяння ў сваіх грахах і маральнага ачышчэння, трапляючы ў шматлікія жыццёвыя перыпетыі, адной з якіх у трэцяй аповесці становіцца вайна. Паводле слоў В.Распуціна, важна, каб "аўтар не адчуваў сябе вышэй за сваіх герояў і не рабіў сябе вопытней за іх" [2]. Прататыпы галоўных герояў пісьменніка – ён сам і яго жонка. Такім чынам, дадзеная акалічнасць з'яўляецца яшчэ адным яскравым сцвярджэннем аб'ектыўнай ацэнкі рэчаіснасці.

Репозиторий ВГУ

Інтэнсіўнае станаўленне і шырокае ўзмацненне псіхалагізму ў літаратуры XX стагоддзя мае глыбокія культурна-гістарычныя вытокі. Не паглыбляючыся ў беларускую гісторыю, варта сказаць, што і для айчыннага культурнага поля яно звязана з актывізацыяй самасвядомасці чалавека. Новую і арыгінальную форму псіхалагізм пачаў выяўляць у шэрагу літаратурных твораў XX стагоддзя. Актывізаваўся мастацкі прынцып, які характарызуецца ўзнаўленнем "плыні свядомасці".

Своеасаблівым сродкам адлюстравання ваеннай рэчаіснасці ў аповесці "Агонь і снег" з'яўляецца прысутнасць такога прынцыпу пры паказе разваг галоўнага героя ў час баёў, напісанні дзённіка, унутраных маналогах. Даведаўшыся, што з'явіўся Мінскі напрамак, Пятро Шапятовіч ліхаманкава рэфлексуе: "І дзіўныя пачуцці апанавалі мяне: да болю ў сэрцы захацелася паехаць туды…Каб хто ведаў, як мне хочацца туды, на зямлю бацькоў, дзе кожная прыдарожная бярозка здавалася б маці, сястрой, жонкай і засланяла б ад куль…Неадольнае жаданне апынуцца там вынікае з нечага больш глыбокага і моцнага. Можа, хочацца прыйсці хутчэй да свайго шчасця…Жаданне гэтае мацней за страх смерці…Жаданне змагацца, жыць… А смерць? Хто ведае. Дзе каго яна напаткае…" [7].

Формы паводзін людзей складаюць адну з неабходных умоў зносін паміж імі. Гэтыя формы вельмі разнастайныя. Характар рухаў, жэстаў, інтанацый залежыць ад камунікатыўнай устаноўкі чалавека, яго намераў і звычак. І.Шамякін вялікую ўвагу надае мастацкай дэталі: партрэтным характарыстыкам герояў, формам іх паводзін, моўным адметнасцям: "Я старанна агледзеў сябе, паправіў рэмень,…казырнуў і адрапартаваў выразна і гучна…Само сабой прыйшло жаданне паказаць сябе ў гэтую хвіліну з найлепшага боку…Купанаў, маленькі, перацягнуты рамянямі, стаячы каля стала, адказыраў, як заўсёды, прыгожа; ён ніколі не адказваў на прывітанне малодшых няўважліва, абыякавым узмахам рукі, як часам робяць іншыя афіцэры" [7].

Свет рэчаў складае істотны бок чалавечай рэальнасці, як першаснай, так і мастацка ўвасобленай. Гэта – сфера дзейнасці і месцазнаходжання чалавека. Рэч звязана з паводзінамі, свядомасцю чалавека і складае неабходны кампанент культуры. Яна пачынае дзейнічаць у духоўнай прасторы. Часцей за ўсё рэчы, што ўводзяцца ў мастацкія тэксты, з'яўляюцца эпізадычнымі: дальнамер Жэні Пясоцкага; старыя скрынкі, якія выкідвае Пятро Шапятовіч; радыё, па якім выступе Сталін; канюшына, пра якую ў лісце піша Саша і інш. Такім чынам, рэчавая канкрэтнасць складае неад'емную і істотную частку слоўна-мастацкай вобразнасці.

Прырода таксама выступае важным паказчыкам назапашанага вопыту чалавецтва. Формы прысутнасці прыроды ў літаратуры разнастайныя: міфалагічнае ўвасабленне яе моцы, паэтычныя ўвасабленні, эмацыйна афарбаваныя меркаванні, апісанні жывёл і раслін, пейзажы. Прырода садзейнічае адлюстраванню не толькі акаляючай рэчаіснасці, але і ўнутранага стану чалавека, яго гармоніі або разладу з ёй і самім сабой. У аповесці "Агонь і снег" адным з паказальных эпізодаў, што адлюстроўвае кантраст мірнага жыцця і ваеннай рэчаіснасці, часовай раз'яднанасці галоўных герояў з'яўляецца ліст Сашы да Пятра: "Сёння паўдня я памагала Ані ўбіраць канюшыну. І Ленка была са мной на полі, гэта недалёка, за копанкай. Помніш, дзе мы сядзелі з табой аднойчы, каля старых вербаў? ...Канюшына…копанка…вербы… І ніводнага слова пра вайну" [7].

Літаратурны твор прасякнуты часавымі і прасторавымі ўяўленнямі, што з'яўляюцца значнай і неад'емнай часткай паказу чалавечай істоты. Хранатоп аповесці складаюць вобразы біяграфічнага часу (сталенне герояў), гістарычнага (ваенная храналогія), касмічнага (уяўленне і развагі пра вечнае, жыццё і смерць), сутачнага (змена дня і ночы, раніцы і вечара), а таксама ўяўленні пра суаднесенасць мінулага, цяперашняга і будучыні (успаміны, разважанні, мары герояў). Не менш разнапланавыя прасторавыя малюнкі, што складаюць канву аповесці: апісанне родных краявідаў, мясцін, дзе давялося пабываць героям, рэальныя і ўяўныя мясціны, блізкая і аддаленая прадметнасць: "Трэці дзень плыве туман. "Як у Лондане", – кажуць хлопцы, хоць, мусіць, нічога раней не чулі пра туманы ў англійскай сталіцы…Пасля спякоты – асенні холад. Ходзім у шынялях. Вось яна – Поўнач!" [7].

Кажучы пра ролю літаратуры, В.Распуцін адзначаў: "У…гадзіны бязбожжа літаратура ў дапамогу царкве…не дазваляла душам людскім зарасці агідай…Літаратура не была невідушчай і заўважала надыход зла, але выраканне дабра для яе было раўназначна таму, як адрачыся ад Бога" [6]. Такім чынам, розныя гістарычныя эпохі і адметныя філасофскія сістэмы накладваюць свой адбітак на разуменне каштоўнасцей. Аксіялагічныя арыентацыі асобы выражаюцца праз мэты, ідэалы, інтарэсы, жыццёвыя планы, прынцыпы, перакананні, з'яўляюцца ўтварэннем ідэйна-мэтавага плана, генеральнай лініяй чалавечага жыцця. Сваю праяву яны знаходзяць у вербалізаваных праграмах і рэальных паводзінах людзей. Сістэма устойлівых каштоўнасных арыентацый асобы, у тым ліку прапушчаных праз прызму мастацкай літаратуры, з'яўляецца паказчыкам таго, што можна чакаць ад індывіда. Пра сацыяльна-палітычную пазіцыю, пра маральны свет асобы можна меркаваць па тым, на дасягненне якіх каштоўнасцей яна накіроўвае свае памкненні. Варта дадаць, што каштоўнасныя арыентацыі выступаюць як абагульнены паказчык

Репозиторий ВГУ

накіраванасці інтарэсаў, патрэб, запытаў асобы, сацыяльнай пазіцыі і ўзроўню маральнага развіцця.

**Літаратура**

1. Голубева, Л. Неразборчивые письмена нашей души / Л. Голубева // Alma mater. – 1999. – №6. – С. 41 – 44.
2. Персонаж и его ценностная ориентация [Электронный ресурс] / Литература и искусство. – Минск, 2014. – Режим доступа: http://studopedia.ru/4 149221 personazh-i-ego-tsennostnaya-orientatsiya.html. – Дата доступа: 19.01.2017.
3. Понятие ценностных ориентаций в литературе [Электронный ресурс] / Психологическая наука. – Минск, 2013. – Режим доступа: http://studbooks.net/894848/psihologiya/ponyatietsennostnyh orientatsiy literature. – Дата доступа: 19.01.2017.
4. Рубинштейн, С.Л. Человек и мир / С.Л. Рубинштейн. – М.: Мир, 1998. – 438 с.
5. Федосова, И.В. Проблема ценностных ориентаций в научной литературе / И.В. Федосова // Психология [Электронный ресурс]. – 2015. – Режим доступа: http:// Downloads/problema-tsennostnyh-orientatsiy-v-nauchnoy-literature. – Дата доступа: 19.01.2017.
6. Ценностные ориентации русской литературы [Электронный ресурс] / Литература. – Минск, 2012. – Режим доступа: http://knowledge.allbest.ru/literature/3c0b65635b3ac69b5d43b89421216c26 0.html. – Дата доступа: 19.01.2017.
7. Шамякін, І. Агонь і снег / І. Шамякін // Беларуская палічка [Электронны рэсурс]. – 2012. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Ivan Samiakin/Ahon i snieh.html#1. – Дата доступу: 19.01.2017.

**T.R. Bagaradava**
Polatsk State University
e-mail: t.baharadava@psu.by

**Means of Axiologic Orientations Expression in**
**I. Shamyakin's 'War' Story 'Fire and Snow'**

*Key words: axiology, values, common human values, value orientations (axiologic values), system of values.*

*In this article some main means of personal axiologic value depiction in fiction is considered. The subject of study is the story 'Fire and Snow' (the third one in I. Shamyakin's pentology 'Troublesome Happiness'). The hierarchy of heroes' axiologic orientations and the updated (by interior and exterior factors) values are shown.*

**В.Ю. Бароўка**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: klit@vsu.by

УДК 821.161.3-3.09”19” -3.09 : 94 (476) “15/16”

**МАСТАЦКАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ АСОБЫ І ДЗЕЙНАСЦІ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ ЯК АКСІЯЛАГІЧНАЯ ПРАБЛЕМА**
**(на матэрыяле беларускай прозы XX стагоддзя)**

*Ключавыя словы: мастацкая інтэрпрэтацыя, рэпутацыя дзеяча культуры, беларуская проза, каштоўнасная шкала, дэтэрмінанты.*

*У артыкуле асэнсавана дынаміка мастацкага асваення беларускай прозай XX стагоддзя асобы і дзейнасці Францыска Скарыны, фарміраванне пісьменнікамі яго гісторыка-культурнай рэпутацыі; вылучаны дэтэрмінанты мастацкай рэпрэзентацыі.*

Культура, па словах Ю.М.Лотмана, – гэта прастора ўласных імёнаў, кожнае з якіх выклікае пэўныя асацыяцыі, звязаныя з рэпутацыяй носьбіта. Францыск Скарына – знакавая постаць у беларускай гісторыі і культуры. Асноўную ролю ў фарміраванні яго гісторыка-культурнай рэпутацыі адыгралі гісторыкі і філосафы, прычыніліся да гэтай справы і літаратары. Першыя спробы мастацкага асэнсавання асобы і дзейнасці Францыска Скарыны ў айчыннай прозе былі зроблены пісьменнікамі 1920-х гадоў. Максім Гарэцкі ў апавяданні “Фантазія” (1921) абраў аналітычны ракурс. Францыск Скарына ў асвятленні Гарэцкага – “вялікі гуманіст”, што будзіў “люд наш паспаліты” “на дабро ўсе вякі і кожны час” [1, с.119]. Ён балюча перажывае за лёс сваіх землякоў у перыяд грамадзянскай вайны: “Клубок зямлі, агорнуты крывавым туманам і згараючы ў ім, рабіў свой вечны шлях у сыстэме сонца.

Найгусцей прыпаў туман на прасторы Беларусі.

Пад гулкі грукат гармат, траскатанне стрэльбаў і пулямётаў, пры водбліску страшных пажарышчаў раздаваліся дзікія воплі і балючыя стагнанні забіваемых, рэзаных, паміраючых з голаду людзей. Могілкі і турмы перапоўніліся. Грэх спавіў кожнае сэрца. Крывёю і слязьмі заплывалі вочы” [1, с.118]. Цень Скарыны склікае цені слынных дзеячаў культуры на вялікі сход, мэта якога – разам знайсці выхад са складанага становішча і падказаць яго народу. Фінал апавядання сэнсава шматзначны: “А клубок зямлі, згараючы ў крывавым тумане, ляцеў і ляцеў сваім вечным шляхам, як бы нічога не было” [1, с.120]. Паводле М.Гарэцкага, культура і літаратура – фундамент,



Репозиторий ВГУ